В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# Займеннік як часціна мовы

| | |
|---|---|
| **Агульнае граматычнае значэнне** | Указвае на:<br>– прадмет і суадносіцца з назоўнікам: я, мы, сябе, хто, штосьці, нехта і інш.;<br>– прымету і суадносіцца з прыметнікам: мой, свой, такі, іншы, які-небудзь, нічый;<br>– колькасць і суадносіцца з лічэбнікам: колькі, ніколькі, колькі-небудзь |
| **Адказвае на пытанні** | хто? што? → суадносныя з назоўнікамі: ён, яны, ніхто;<br>які? чый? → суадносныя з прыметнікамі: той, усякі, наш;<br>колькі? → суадносныя з лічэбнікамі: столькі |
| **Марфалагічныя прыметы** | Усе займеннікі змяняюцца па склонах: хто, каго, каму і г. д.<br>Многія маюць формы роду і ліку (суадносныя з прыметнікамі і асабовыя): мой, мая, маё, мае, ён, яна, яно, яны |
| **Сінтаксічная роля** | Часцей — дзейнік, азначэнне, дапаўненне; рэдка — выказнік, акалічнасць: Калі б вы ведалі... Ярка нам сонца свеціць. Усё ў абрысах гэтага твару... Аловак мой! Некалькі разоў Іван наведаў брата. |

# Разрады займеннікаў

| Разрад | Займеннікі | Значэнне |
|---|---|---|
| Асабовыя | я, ты, ён, яна, яны, мы, вы, яно | указваюць на асобу, прадмет |
| Зваротны | сябе | указвае, што аб'ект дзеяння — сам утваральнік дзеяння |



© ТДА «Аверсэв»

| Разрад | Займеннікі | Значэнне |
|---|---|---|
| Прыналежныя | мой, твой, свой, наш, ваш, яго, яе, іх | указваюць на прыналежнасць прадмета |
| Указальныя | гэты, той, такі, гэтакі, столькі, гэтулькі | указваюць на прадмет, прымету, колькасць |
| Азначальныя | сам, самы, увесь, усякі, кожны, любы, іншы | значэнне самастойнасці, абагульнення, выдзяляльнасці |
| Пытальныя | хто, што, які, чый, каторы, колькі | выражаюць запытанне пра асобу, прадмет, якасць, колькасць |
| Адносныя | хто, што, які, чый, каторы, колькі | выражаюць адносіны паміж часткамі складаназалежнага сказа |
| Няпэўныя | нехта, нешта, абы-хто, абы-што, сёй-той, сёе-тое, нечы, нейкі, некаторы, абы-чый, абы-які, абы-каторы, некалькі, якісьці, чыйсьці, хтосьці, хто-небудзь, што-небудзь, які-небудзь | абазначаюць няпэўныя асобы, прадметы, якасці, прыналежнасць, колькасць |
| Адмоўныя | ніхто, нішто, ніякі, нічый, ніколькі | выражаюць адсутнасць асобы, прадмета, прыметы, колькасці |



© ТДА «Аверсэв»

# Скланенне займеннікаў

## 1. Асабовыя займеннікі

| Склон | Адзіночны лік | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | я | ты | ён□ яно | яна |
| Р. | мяне | цябе | яго | яе |
| Д. | мне | табе | яму | ёй |
| В. | мяне | цябе | яго | яе |
| Т. | мной(-ою) | табой(-ою) | ім | ёй (ёю) |
| М. | (аба) мне | (аб) табе | ім | ёй |

| Склон | Множны лік | | |
|---|---|---|---|
| Н. | мы | вы | яны |
| Р. | нас | вас | іх |
| Д. | нам | вам | ім |
| В. | нас | вас | іх |
| Т. | намі | вамі | імі |
| М. | (аб) нас | вас | іх |

Асновай займеннікаў ён, яна, яно, яны ва ўскосных склонах з'яўляецца адзін гук [й]: ён□ — йаго, йаму і г. д.; яна — йае, йой...; яно — йаго, йаму...; яны — йіх, йім...

## 2. Зваротны і прыналежныя займеннікі

| Склон | Зваротны | Прыналежныя (мой, твой, свой) | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Адзіночны лік | | Множны лік |
| Н. | — | свой□ сваё | свая | свае |
| Р. | сябе | свайго | сваёй | сваіх |
| Д. | сабе | свайму | сваёй | сваім |
| В. | сябе | свайго, свой, сваё | сваю | як Н. або Р. |
| Т. | сабой(-ою) | сваім | сваёй(-ёю) | сваімі |
| М. | (аб) сабе | (аб) сваім | сваёй | (аб) сваіх |



© ТДА «Аверсэў»

## 3. Указальныя займеннікі

| Склон | той, такі, гэты, гэтакі (як прыметнікі з адпаведнай асновай) | | | | столькі, гэтулькі |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. | той | тое | тая | тыя | столькі |
| Р. | таго | | той(-ае) | тых | стольkіх |
| Д. | таму | | той | тым | стольkім |
| В. | як Н. або Р. | тое | тую | як Н. або Р. | як Н. або Р. |
| Т. | тым | | той(-ою) | тымі | стольkімі |
| М. | (аб) тым | | той | тых | (аб) стольkіх |

## 4. Азначальныя займеннікі

| Склон | увесь, усё, уся, усе (як прыметнікі на мяккі н) | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | увесь□ | усё | уся | усе |
| Р. | усяго | усяго | усёй(-яе) | усіх |
| Д. | усяму | усяму | усёй | усім |
| В. | як Н. або Р. | усё | усю | як Н. або Р. |
| Т. | усім | усім | усёй(-ёю) | усімі |
| М. | (аб) усім | усім | усёй | усіх |

| Склон | сам, самы, кожны, іншы (як прыметнікі з цвёрдай асновай) самі (як прыметнікі з мяккая асновай) | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | сам□ | самó | самá | самі |
| Р. | самóга | самóга | самóй(-óе) | саміх |
| Д. | самóму | самóму | самóй | самім |
| В. | самóга | само | самýю(-ý) | як Н. або Р. |
| Т. | самі́м | самі́м | самóй(-óю) | самімі |
| М. | (аб) самі́м | самі́м | самóй | саміх |

| Склон | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | сáмы | сáмае | сáмая | самыя |
| Р. | сáмага | сáмага | сáмай(-ае) | самых |
| Д. | сáмаму | сáмаму | сáмай | самым |
| В. | як Н. або Р. | сам | сáмую | як Н. або Р. |
| Т. | сáмым | сáмым | сáмай(-аю) | самымі |
| М. | (аб) сáмым | сáмым | сáмай | самых |



© ТДА «Аверсэв»

## 5. Пытальныя і адносныя займеннікі

| Склон | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. | хто | што | чый□ чыё | чыя | чые |
| Р. | каго | чаго | чыйго | чыёй(-е) | чыіх |
| Д. | каму | чаму | чыйму | чыёй | чыім |
| В. | каго | што | як Н. або Р. чыё | чыю | як Н. або Р. |
| Т. | кім | чым | чыім | чыёй(-ёю) | чыімі |
| М. | (аб) кім | чым | чыім | чыёй | чыіх |

## 6. Няпэўныя займеннікі

| Склон | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | нешта | штосьці | абы-які | чый□-небудзь |
| Р. | нечага | чагосьці | абы-якога | чыйго-небудзь |
| Д. | нечаму | чамусьці | абы-якому | чыйму-небудзь |
| В. | нешта | штосьці | як Н. або Р. | як Н. або Р. |
| Т. | нечым | чымсьці | абы-якім | чыім-небудзь |
| М. | (аб) нечым | чымсьці | абы-якім | чыім-небудзь |

## 7. Адмоўныя займеннікі

| Склон | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. | ніхто | нішто | ніякі | нічый□ | нічыя |
| Р. | нікога | нічога | ніякага | нічыйго | нічыёй(-е) |
| Д. | нікому | нічому | ніякаму | нічыйму | нічыёй |
| В. | нікога | нішто | як Н. або Р. | нічый□ | нічыю |
| Т. | нікім | нічым | ніякім | нічыім | нічыёй(-ёю) |
| М. | ні аб кім | ні аб чым | ні аб якім | ні аб чыім | ні аб чыёй |



© ТДА «Аверсэв»

## Правапіс займеннікаў

Займеннікі з постфіксам -сьці (-сь) пішуцца ў адно слова: хтосьці (хтось), якісьці (якісь), чыйсьці (чыйсь).

Займеннікі з постфіксам -небудзь і прыстаўкай абы- пішуцца праз злучок: што-небудзь, абы-што.

Калі на не падае націск і паміж займеннікам і не няма прыназоўніка, тады не з займеннікам пішацца разам: не́хта, не́каму, не́кім; але: не́ к каму, не́ з кім.

Калі на не націск не падае, не пішацца асобна: не такія, не я.

Неабходна адрозніваць звароты не хто іншы, як..., не што іншае, як... ад зваротаў ніхто іншы не..., нішто іншае не...

# Марфалагічны разбор займенніка

## План разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.
2. Пачатковая форма (Н. скл. адз. л.).
3. Марфалагічныя прыметы:
а) нязменныя: разрад, асоба (у асабовых);
б) зменныя: род (калі ёсць), лік (калі ёсць), склон.
4. Сінтаксічная роля.

## Узор разбору

Нічые галасы не парушалі нашай цішыні.

*Нічые* — займеннік, указвае на адсутнасць прыметы.

Пачатковая форма *нічый*, адмоўны, ужыты ў множным ліку, назоўным склоне.

У сказе з'яўляецца азначэннем.



© ТДА «Аверсэв»